Тэма урока:

# Адасобленыя акалічнасці

- ✔ Засвоіць адасабленне, як сэнсавае і інтанацыйнае выдзяленне сказа;
- ✔ Зразумець сутнасць адасобленых акалічнасцей

- Развіваць уменне адасабляць члены сказаў;
- Звярнуць увагу на адметнасць адасобленых акалічнасцей, выражаных дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі зваротамі, ад фразеалагізмаў тыпу на ноч глездячы;
- Навучыцца адрозніваць словы тыпу стоячы, лежачы і пад. ад адасобленых дзеепрыслоўяў;

# Адасобленымі называюцца

**Члены сказа, выдзеленыя па сэнсе і інтанацыйна**

- **Песні, поўныя захаплення, прысвячае ён працаўнікам калгасных палёў.**
- **Гаспадыня, жанчына жвавая і гаваркая, сустрэла мяне ветліва і гасцінна.**

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары, раскрываючы дужкі і расстаўляючы знакі прыпынку:

## <u>I варыянт</u>

Васіль а...чуваў што (з)заду стаіць маці пазірае (у)след ласкавая і гордая і ад гэтага ў руках сілы быццам большала.

## <u>II варыянт</u>

(Па)абапал вузкага гасцінца зарос..ага мя...кай мураўкай ляжала (не)агляднае поле залацістага жыта.

# Правяраем:

Васіль адчуваў, што ззаду стаіць маці, пазірае ўслед, ласкавая і гордая, і ад гэтага ў руках і нагах сілы быццам большала

Паабапал вузкага гасцінца, заросшага мя**кк**ай мураўкай, ляжала неаглянае поле залацістага жыта.

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары, раскрываючы дужкі і расстаўляючы знакі прыпынку:

I варыянт

Калі дзе...і былі малыя ён Антанюк (з)рэдку расказваў ім пра свае партызанскія справы.

II варыянт

Га(н, нн)а маці Лабановіча была жанчына добрая працавітая усё старалася зрабі...ь сама.

# Правяраем:

Калі дзеці былі малыя, ён, Антанюк, зрэдку расказваў ім пра свае партызанскія справы.

Ганна, маці Лабановіча, была жанчына добрая, працавітая, усё старалася зрабіць сама.

# Адасобленыя акалічнасці

# Адасабляюцца:

1.

а) |_._._._ , |...

...,| _._._._ ,| ...

...,|_._._._|.

б)_._._._ , ...

..., _._._._ , ...

..., _._._._ .

2.

, **няглeдзячы на** ,

—.—.—.—.—. — .—

# Не адасабляюцца, не выдзяляюцца коскамі

1) фразеалагізмы: склаўшы рукі, нясолана хлябаўшы, на ноч гледзячы, заплюшчыўшы вочы і інш.

- Ён тут думае, што я сяджу склаўшы рукі (нічога не раблю).
- Але: Дзяўчынка села за парту, склаўшы рукі.(паклала адна на адну)

2) Не выдзяляюцца коскамі сумежныя адасобленыя дзеепрыслоўі, звязаныя злучнікамі і, ды,ці.

- Махнач стаяў каля сціrты саломы, як заўсёды, утаропіўшы вочы ў зямлю і сашчапіўшы рукі на жываце.

3) Ад адасобленых дзеепрыслоўяў трэба адрозніваць словы стоячы, лежачы, седзячы, спяшаючыся, гуляючы і інш., якія маюць прыслоўнае значэнне.

- Паравозчык грабе стоячы.

як?



# Фізкультхвілінка

Практыкаванне №285

I варыянт 1-4 сказ

II варыянт 5-7 сказ

Узаемаправерка

# Чацверты лішні

1. Шуміць рака, вясёлая, жывая.
2. Вакол, ападаючы, шамацела лісце.
3. Люблю свой край, зялены і спакойны.
4. Настала ноч, з цішыней і зорамі.

# Правяраем

**Вакол, ападаючы, шамацела лісце.**

# Чацверты лішні

1. Нягледзячы на дрэннае надвор’е, дзеці пайшлі гуляць.
2. На ганку маці, выйшаўшы, стаіць.
3. Косця Раднік, загадчык новага клуба, сустракаў гасцей і быў надзвычай ветлівы.
4. Забыўшыся пра ўсё на свеце, я ўважліва разглядаў жураўлёў.

# Правяраем

Косця Раднік, загадчык новага клуба, сустракаў гасцей і быў надзвычай ветлівы.

# Чацверты лішні

1. Яна, прырода, натуральна ўпрыгожыла столь і сцены падземнага палаца сваімі скарбамі.
2. Сонца, зрабіўшы свой штодзённы кругабег, апусцілася зусім нізка і, стаміўшыся, пачало хіліцца на захад.
3. Грабцы – дзяўчаты, маладзіцы – штораз варушацца жывей, бо чуюць голас навальніцы, а хмары коцяцца бліжэй.
4. З усіх сродкаў выхавання, якія ёсць у нас, у людзей, самым выпрабавальным і надзейным было і будзе слова.

# Правяраем

Сонца, зрабіўшы свой штодзённы кругабег, апусцілася зусім нізка і, стаміўшыся, пачало хіліцца на захад.

# Чацверты лішні

1. Сіне - ружовае світанне паволі рассцілаецца на зямлі, плывучы непрыкметна з далёкіх небасхілаў.
2. Жаваранак і шпак, спяваючы, не хаваліся.
3. Машына імчыць, гудзе, адкрываючы на кожным павароце ўсё новыя і новыя дзівы.
4. Хлопец рос на лес гледзячы.

# Правяраем

Хлопец рос

на лес гледзячы.

# Вынікі ўрока:

- Што мы даведаліся пра адасобленыя акалічнасці?
- Чыя работа на ўроку вам асабліва спадабалася?
- Ці задаволены вы сваёй работай на ўроку?
- Ацаніце, калі ласка, сваю работу.

# Дамашняе заданне

**Паўтарыць §§38,39**

**Вывучыць §40**

**I практ.289**

**II практ. 290(пераклад)**

**III стварыць плакат-апору “Адасобленыя члены сказа” (карыстаючыся набытымі ведамі па гэтай тэме)**

Жадаем поспеху!